
М.Танк (1978)

# «АЖ СЭРЦА СЦІСКАЕЦЦА...»

***Мікола МІКУЛІЧ,** загадчык аддзела ўзаемасувязей літаратур Інстытута мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы НАН Беларусі*

*Сёлета будзе адзначацца 100 гадоў з дня нараджэння выдатнага беларускага паэта, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча, акадэміка Максіма Танка (Яўгена Іванавіча Скурко), які нарадзіўся 17 верасня 1912 года ў вёсцы Пількаўшчына былога Вілейскага павета Віленскай губерні (цяпер Мядзельскі раён).*

М.Танк пражыў вялікае, насычанае яркімі падзеямі і мастацкімі адкрыццямі жыццё. Ён пакінуў пасля сябе дзесяткі арыгінальных паэтычных кніг, кожная з якіх з'яўляецца этапнай у гісторыі беларускай літаратуры XX ст. Паэту належаць творы непрамінальнай красы і сілы эмацыянальнага ўздзеяння — вершы «Спатканне», «Песня кулікоў», «Родная мова», «Рукі маці», «Ave Maria», «Перапіска з зямлёй», «Перакройванне шыняля», «Мыццё бабкі Улляны», «Мне пагаварыць бы», «Калі горыччу перапоўнена сэрца...», паэмы «Сказ пра Вяля», «Люцыян Таполя» і іншыя, што зрабілі б гонар любой нацыянальнай культуры свету. У перакладах лепшых спецыялістаў яго кнігі выдаваліся ў Расіі, на Украіне, у Літве, Латвіі, Польшчы, Балгарыі, Чэхаславакіі, Югаславіі, Кітаі, іншых краінах. Па сіле і размаху прыроднага дару, ідэйна-мастацкага мыслення, сцвярджэнні спаконвечных асноў народнага жыцця, па адмысловай якасці і самабытнасці рэалізацыі ў слове высокай эстэтыкі чалавечага духу Максім Танк пераўзыходзіць многіх вядомых і аўтарытэтных еўрапейскіх майстроў прыгожага пісьменства, лаўрэатаў знакамітай Нобелеўскай прэміі.

Паэт выхоўваўся ў дружнай і працавітай сялянскай сям'і, аснову якой складалі дзед Хведар Маркавіч Скурко — валявая, каларытная асоба, вечныя працаўнікі-руплівцы — бацька Іван Хведаравіч і маці Домна Іванаўна. У ёй панавалі шчырасць і цеплыня, узаемаразуменне і павага, характэрнае душэўна-чалавечае супольніцтва. Кожны тут клапаціўся пра кожнага, вымяраў свае імкненні і дзеянні сістэмай агульных каардынат і крытэрыяў, сямейных каштоўнасцей і прыярытэтаў.

Гэта і шмат што яшчэ добра пацвярджае дужа красамоўны і характарыстычны дакумент, які каторы ўжо год захоўваецца ў маім хатнім архіве, — ліст Язэпа Семяжона да Максіма Танка і яго жонкі Любові Андрэеўны. Я. Семяжон быў выдатным беларускім перакладчыкам, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР, Заслужаным работнікам культуры Беларусі, мужам малодшай сястры Максіма Танка Людмілы Іванаўны. 18 лютага 1968 года Я. Семяжон тужліва пісаў з Мінска ў Маскву пра дрэнны стан здароўя яго бацькі, заклікаў паспець прыехаць у родную Пількаўшчыну.

У гэтыя дні М. Танк, першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, знаходзіўся ў Маскве ў камандзіроўцы, рыхтаваўся да ўдзелу ў рабоце сакратарыята праўлення Саюза пісьменнікаў СССР. 23 лютага паэт збіраўся выехаць у Мінск, а адтуль — у Пількаўшчыну, аднак раніцай яго ажалобіла цяжкое паведамленне аб смерці бацькі. Пра гэта ў яго дзённікавых нататках знаходзім поўны адчаю і гаркоты запіс: «23.02.1968 г. Атрымаў тэлеграму ад Мілкі. Памёр папа ўчора вечарам 22-га. Я многіх страціў, але гэта страта — страшная і балючая. Адыйшоў чалавек, якому я абавязан усім і нічым яму не змог дапамагчы, адудзячыць, кроме пустой славы, што

ён — бацька вядомага паэта. Ехаць у Мінск не хацеў — не хацеў адрывацца ад зямлі і быць хоць крыху залежным ад дзяцей. Які гэта быў сціплы і вялікі чалавек! Вялікі і святы».

Дрогкім марозным ранкам 24 лютага 1968 г., у дзень пахавання бацькі, М.Танк быў ужо ў Мінску і практычна адразу разам з некаторымі роднымі і блізкімі, якія яго чакалі, выехаў у Пількаўшчыну. Сэрца паэта разрывалася ад віны і болю па цяжкой, незваротнай страце. «Дома засталі поўную хату людзей, — запіша ён пазней у дзённіку. — Тата ляжаў прыбраны ў труне. Паклалі яму ў галаве прывезеныя кветкі і шапку. Хвароба так яго адчарніла, што і пазнаць было цяжка. Страшна выглядала і мама, якая каля двух месяцаў пакутавала з татам. Шкада, што я не змог з ім пабачыцца перад смерцю. Казалі, ён, атрымаўшы маё пісьмо, заплакаў. Адчуваў тата яшчэ восенню, што гэту зіму ён не перажыве. Відаць, заўсёды буду вініць сябе, што праз праклятыя свае камандзіроўкі не змог яго наведаць».

Застаўшыся на хутары адна, хворая і нямоглая Домна Іванаўна не магла абыйсціся без клопату і ўвагі сваіх родных і блізкіх і найперш — сыноў


Іван Хведаравіч і Домна Іванаўна

Яўгена і Хведара і дачкі Людмілы. Вядома, яны ўсяляк імкнуліся дапамагчы ёй. Што датычыць старэйшага сына, Максіма Танка, дык ён фактычна пры любой магчымасці і нагодзе вырываўся ў Пількаўшчыну, каб наведаць родныя мясціны, прывезці маці ўсё неабходнае, дапамагчы па гаспадарцы, проста пабыць з ёю — падтрымаць душэўнай гутаркай, развеяць цяжкія думы. «Ездзіў у чытаем да болю шчымлівы дзённікавы запіс паэта ад 5 жніўня 1969 г. — Пахадзіў па лясных сваіх нетрах, зайшоў у пуню дзе яшчэ ляжаць снапы і пласты сена, яшчэ сабраныя бацькам. Стаяць у кутку яго кош, граблі, вілы, сталярскі струмант, а самога гаспадара няма. І мама такая хворая, што аж страх глядзець. Абрадавалася, што прыехаў. На адыходзе, як заўсёды, перажагнала мяне. З хаты ўжо не выходзіла. Слабая».

Гэты і многія іншыя дзённікавыя запісы М. Танка ўспрымаюцца як абразок высокіх духоўна-маральных клопатаў і турбот вялікага грамадзяніна і патрыёта роднай зямлі, прамяніста-светлай асобы, носьбіта выдатных душэўна-чалавечых якасцей, клапатлівага сына сваіх бацькоў — простых беларускіх сялян.

У 1968 г. М. Танку было прысвоена ганаровае званне народнага паэта БССР, праз год яго, ужо дэпутата і старшыню Вярхоўнага Савета БССР, абяруць дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР, а яшчэ праз два — старшынёй праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. У 1972 г. паэт стане акадэмікам Акадэміі навук БССР, а ў 1974 г. — Героем Сацыялістычнай Працы. У 1970-я гг. пабачаць свет ці не лепшыя яго кнігі — «Хай будзе святло» (1972), «Дарога, закалыханая жытам» (1976), «Прайсці праз вернасць» (1979), якія атрымаюць высокую ацэнку не толькі грамадска-культурнай супольнасці Беларусі і Савецкага Саюза, але і еўрапейскай крытыкі — польскай, чэшскай, англійскай і інш. За зборнік вершаў у перакладзе на рускую мову «Нарачанскія сосны» (1977) яму будзе прысуджана Ленінская прэмія — найвышэйшая адзнака працы і яе вынікаў у былым СССР. Але пра ўсё гэта, на жаль, ужо не будзе ведаць яго маці Домна Іванаўна, якой не стане 30 чэрвеня 1971 г.

Як і ў выпадку з бацькам, па збегу акалічнасных абставін у дзень смерці маці Максім Танк знаходзіўся ў Маскве — на гэты раз прымаў удзел у рабоце пятага з'езда Саюза пісьменнікаў СССР. Атрымаўшы тэлеграму з цяжкай весткай, паэт адразу вылецеў у Мінск і неўзабаве быў у Пількаўшчыне. Пра развітанне з самым блізкім і дарагім на зямлі чалавекам ён запіша ў сваім

дзенніку 13 ліпеня: «Мама ляжала ў труне, збітай з нейкіх таўшчэзных дошчак. Худзенькая, як лучынка. Здаецца, упершыню ў сваім жыцці так спакойна адпачывала. Перад смерцю скардзілася: «Чым я так саграшыла, што і зямелька не хоча мяне забіраць…» Перад маім ад’ездам у Маскву, калі Федзя спытаў у яе, ці пазнае мяне, сказала: «І нашто я цябе, сынок, вучыла? Быў бы ты заўжды са мной...» Часамі ёй здавалася, што яна не дома, а ў Мінску. І тады прасіла, каб яе завезлі ў Пількаўшчыну, дзе яна магла б надыхацца свежым паветрам. Калі падавалі ёй ваду, не забывалася падзякаваць. Ёй, відаць, здавалася ўсё жыццё, што толькі яна павінна ўсіх даглядаць і абслугоўваць. Да апошняй хвіліны свайго жыцця непакоілася, што не можа нас пачаставаць...»




І далей: «Не стала на зямлі нашай Маці, з якой я нікога не магу параўнаць па сціпласці, працавітасці, любові да дзяцей і святасці. Ніхто, як яна, не ўмеў радавац-ца, калі мы яе наведвалі. Блаславўляла, калі прыязджалі, хрысціла, калі клаліся спаць, калі пакідалі яе. Цяпер днём і ноччу стаіць перад маімі вачамі».

Вобраз маці М. Танк пранясе праз усё сваё жыццё. Ён будзе сілкаваць сацыяльна-маральную энергетыку паэта, трымаць яго ў цяжкія часіны нягод, выпрабаванняў і страт, прасвятляць духоўна, натхняць на творчыя пошукі і адкрыцці. «Матчына малітва, якая не раз Вяртала» мастака «нават з-за свету», будзе саграваць яго сэрца да самых апошніх жыццёвых змрокаў. «Самы святы і нерукатворны» вобраз маці-працаўніцы, маці-руплівіцы з яе вечнымі трывогамі і перажываннямі за сваіх дзяцей і блізкіх, за роднае котлішча ярка і пераканаўча паўстае ў вершах М. Танка «У па-рэпанай раме дзвярэй», «Помню: маці заўсёды клалася спаць...», «На прызбе» і інш.

«Непрытульны Слабадскі пагост» даў вечны супачынак і маці, і самому паэту. Такім было яго завяшчанне.

Падымешся па мулкай сцежцы, усланай апалай ігліцай і падсохлай лістотай, на высокі ўтравелы грудок, убачыш у нагах маці велічную магілу яе знакамітага сына — і сэрца міжволі сціснецца ў невыказнай самоце і вусцішнасці.

*Материал взят из газеты «Веды» № 12(2376)*